ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1982
16
СНЕЖНЯ
ЧАЦВЕР
№ 37 (1375)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### ПЕРШАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

навуковага гуртка публіцыстыкі адбылося на факультэце журналістыкі. Змястоўную дыскусію выклікала выступленне загадчыка аддзела навукі часопіса «Камуніст Беларусі» У. А. Хацяноўскага.

**Н. БАБКО,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

### КАМСАМОЛЬЦЫ

першай групы трэцяга курса кафедры фізічнай оптыкі фізічнага факультэта наведалі школьны музей баявой славы імя Героя Савецкага Саюза Шабана. Групу ўзначаліў камсорг і ініцыятар урока мужнасці Уладзімір Юрэвіч.

Была праведзена сустрэча з камсамольскім актывам клуба «Мужнасць», арганізаваны прагляд і абмеркаванне матэрыялаў і экспазіцый школьных музеяў. Студэнты падарылі музею прыгожа аформлены стэнд «Мінск — горад-герой з даравальным надпісам.

**С. МЕЛЬНІК,**
**намеснік сакратара партыйнай арганізацыі школы № 3 г. Мінска.**

### ПІЧЭТАЎСКІЯ ЧЫТАННІ

прайшлі на гістарычным факультэце і прысвячаліся 60-годдзю ўтварэння СССР. Працавалі тры секцыі: гісторыі СССР эпохі сацыялізму, гісторыі СССР дасавецкага перыяду і агульнай гісторыі БССР на міжнароднай арэне.

**І. ВАЛАСЕВІЧ,**
**супрацоўніца бібліятэкі.**

### НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЯ

канферэнцыя прайшла на факультэце журналістыкі і прысвячалася 60-годдзю ўтварэння СССР. З цікавымі і змястоўнымі дакладамі выступілі студэнты чацвёртага курса С. Гук, С. Дубавец, А. Новікава, А. Мозалева, А. Баран.

Выразнасцю, эмацыянальнасцю, самастойнасцю ў даследаванні праблемы вызначалася выступленне студэнткі 3-га курса Л. Сакаловай на тэму «Дарогамі Коласа па Палессі».

**А. МАКСІМАВА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

## ВЕСТКІ З ПАДРЫХТОЎЧАГА АДДЗЯЛЕННЯ





*ПАЧАЛІСЯ заняткі на падрыхтоўчым аддзяленні. Сёлета да паступлення на факультэты рыхтуюцца 168 слухачоў — будучыя філолагі, гісторыкі, юрысты, журналісты... Выкладчыкі ўсіх факультэтаў вядуць дысцыпліны, па якіх у ліпені слухачы здадуць экзамены на права вучыцца ў БДУ імя У. І. Леніна.*

*НА ЗДЫМКУ: заняткі па рускай мове ў групе вядзе выкладчыца кафедры рускай мовы філалагічнага факультэта Жанна Эдуардаўна Бычкоўская.*

Фота В. Шачака.

## З НАШАЙ ПОШТЫ

# МАРШ МІРУ

8 СНЕЖНЯ Ў МІНСК прыбыў агітпоезд ЦК ВЛКСМ «Комсомольская правда». Яго шлях пралягае праз усю нашу краіну: ад берагоў Ціхага акіяна да крэпасці-героя Брэста. У многіх гарадах нашай Радзімы, на ўдарных камсамольскіх будоўлях прайшлі мітынгі пратэсту супраць нарошчвання гонкі ўзбраенняў, адбыліся сустрэчы камсамольцаў, моладзі з удзельнікамі агітпоезда.

Раніцой, адразу пасля прыбыцця агітпоезда, адзін з яго ўдзельнікаў, загадчык кафедры ваенна-патрыятычнага выхавання Вышэйшай камсамольскай школы пры ЦК ВЛКСМ, Герой Савецкага Саюза Уладзімір Аляксандравіч Наржынскі стаў госцем БДУ імя У. І. Леніна. Ён азнаёміўся з музеем БДУ, наведаў камітэт камсамола. У парткоме універсітэта адбылася гутарка У. А. Наржынскага з сакратаром партыйнага камітэта М. Г. Елісеевым і прарэктарам БДУ прафесарам У. Р. Івашыным.

У актавай зале Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута адбылася сустрэча камсамольцаў універсітэта і МДПІ з удзельнікамі агітпоезда. Яе адкрыў намеснік сакратара камітэта камсамола МДПІ Н. Ждановіч. Сваімі ўспамінамі аб ратным подзвігу савецкіх людзей ў гады Вялікай Айчыннай вайны падзяліўся са студэнтамі У. А. Наржынскі. Закончылася сустрэча канцэртам вакальна-інструментальнай групы палітычнай песні «Плакат» факультэта журналістыкі МДУ.

Тры гадзіны дня. Над Хатынскім мемарыялам гучаць словы паэта: «Вспомним их поименно, горем вспомним своим. Это нужно не мёртвым, это надо живым». Апалены полымем вайны куточак беларускай зямлі стаў месцам правядзення масавага мітынгу, у якім, разам з прадстаўнікамі дзесяткаў прадпрыемстваў, навуковых і іншых устаноў Мінска прынялі ўдзел камсамольцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Да Вечнага агню ўскладаюцца жывыя кветкі. Мінутай маўчання ўшанавалі прысутныя памяць ахвяр фашызму, памяць мільёнаў савецкіх людзей, якія аддалі сваё жыццё за светлае будучае маладога пакалення нашай планеты.

Да савецкай моладзі, да моладзі ўсіх краін з заклікам берагчы мір звярнуўся ветэран вайны, генерал артылерыі ў адстаўцы В. Т. Гадуноў. Рэдактар журнала «Маладосць» Анатоль Грачанікаў, шліфоўшчык Мінскага трактарнага завода Анатоль Чарапавец выказалі пратэст супраць спроб імперыялістычных колаў спіхнуць людзей у полымя тэрмаядзернай катастрофы, заклікалі моладзь згуртаваць свае намаганні ў барацьбе за справу міру.

Ад імя камсамольцаў БДУ імя У. І. Леніна перад удзельнікамі мітынгу выступіла студэнтка механіка-матэматычнага факультэта Галіна Краўчанка.

Удзельнікі мітынгу прынялі рэзалюцыю ў адрас штаб-кватэры ААН.

Агітпоезд ЦК ВЛКСМ завершыць сваю работу 17 снежня ў Брэсце.

**Ю. ВАРАТНІЦКІ,**
**кіраўнік прэс-цэнтра камітэта камсамола.**

## Памяць аб вучоным

АДКРЫТА мемарыяльная дошка на доме, дзе жыў вядомы савецкі матэматык акадэмік АН БССР Ф. Д. Гахаў.

З 1961 года Ф. Д. Гахаў працаваў у Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна. За сваю пяцідзесяцігадовую навуковую і педагагічную дзейнасць Ф. Д. Гахаў падрыхтаваў 11 дактароў і каля 50 кандыдатаў навук. Ім апублікаваны шэраг фундаментальных прац па тэорыі аналітычных функцый і інтэгральных ураўненняў. Ф. Д. Гахава вызначалі выключная працавітасць, прынцыповасць, патрабавальнасць да сябе і да іншых. Шырокая навуковая эрудыцыя, партыйнасць, чалавечая дабрата і ўвага да людзей заваявалі яму заслужаны аўтарытэт таленавітага вучонага, вопытнага педагога і выхаваўцы моладзі.

**А. МАРЫЧАЎ,**
**дацэнт кафедры тэорыі функцый.**

## Дар кафедры

НА КАФЕДРЫ вышэйшай матэматыкі ФПМ на працягу ўжо 10 гадоў вядзецца работа, якую ўзначальвае прафесар Ю. С. Багданаў, па складанню рэфератаў для часопісаў «РЖ Математика», «РЖ Механика» і «Мэсімэтыкэл рэвюз». Гэтыя выданні аператыўна друкуюць рэфераты практычна ўсіх навуковых артыкулаў і кніг па матэматыцы і механіцы, і таму яны заўсёды выкарыстоўваюцца ў рабоце большасцю спецыялістаў.

На жаль, бібліятэка універсітэта ў апошні час не мела магчымасці выпісваць часопіс «Мэсімэтыкэл рэвюз». Таму мы высока цэнім тое, што па ініцыятыве Ю. С. Багданава кафедра вышэйшай матэматыкі перадала бібліятэцы БДУ 30 тамоў гэтага часопіса.

**І. АРЭХОЎСКАЯ,**
**дырэктар бібліятэкі.**

## ТВАЯ АКТЫЎНАЯ ЖЫЦЦЁВАЯ ПАЗІЦЫЯ

# Шукаць неспакою

ПРАБЛЕМА АКТЫЎНАЙ ЖЫЦЦЁВАЙ ПАЗІЦЫІ. Чаму ўзнікла яна? Скептыкі, усміхаючыся, гавораць: «Гэта ад таго, што ў сучаснай моладзі не хапае цяжкасцей, само жыццё прывучае іх да інфантыльнасці». І хаця цалкам з гэтым згадзіцца нельга, доля праўды тут ёсць. У студэнцкіх размовах можна пачуць, што грамадскае жыццё не патрабуе цяпер таго гарэння, той барацьбы, якія былі ўласцівы камсамольцам старэйшых пакаленняў. Сёння, маўляў, трэба змагацца толькі з паперкамі, гэтым своеасаблівым сімвалам фармалізму. Паперы, кажуць, засланілі ад грамадскіх работнікаў усё жывое жыццё. Гэтую ж думку выказваюць і некаторыя з тых, хто паспрабаваў «цягнуць лямку» грамадскай работы.

Гавораць, што цяжка сумяшчаць грамадскую работу з вучобай — нешта абавязкова будзе атрымлівацца горш. Але шматлікі вопыт тых, каму такое сумяшчэнне ўдаецца, сведчыць: калі адкінуць лянотy і абыякавасць, можна паспець усё. А фармуліроўка «няздатны да грамадскай работы» патрэбна для таго, каб за яе схавацца, пазбегнуць даручэнняў, апраўдаць свае ўласныя пралікі.

Хто і як трапляе ў «грамадскія дзеячы»? Як звычайна выбіраюць іх на справаздачных сходах? Ёсць тут адзін адмоўны момант: сход збіраецца пасля заняткаў, усе спяшаюцца. У выніку — абы хутчэй. І выбіраюць не заўсёды тых, хто варты даверу. Трапляюць у «лідэры» і тыя, хто не збіраўся і не збіраецца выконваць як трэба даручаную справу. Яны не адмаўляюцца, бо ведаюць: існуе грамадска-палітычная атэстацыя, там іх «пасада» залічыцца...

Тым жа, хто робіць справу як трэба, часта даводзіцца літаральна біцца аб сцяну нашай агульнай абыякавасці.

З аднаго боку, мы не хочам фармалізму, з другога — палохаемся тых цяжкасцей, якія нясе з сабой даручэнне. Ні для каго не сакрэт, якое насычанае і, згадзімся, складанае жыццё ў тых, хто сур'ёзна ставіцца да грамадскай работы. Іх дзейнасць стане менш складанай і больш паспяховай, калі не будзе цягнуць назад мёртвы груз «пасіўнага актыву»...

**І. АРЛОЎ,**
**інструктар сектара сацыялістычнага спаборніцтва камітэта камсамола факультэта журналістыкі.**

# МЫ — САВЕЦКІЯ!

## ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТА АКТЫВІСТА

## КІМ СПРАВА СТАВІЦЦА?



УЖО НА ШТО ШАДУРСКАМУ пашанцавала, дык гэта на сяброў. Не, не на тых, што пры сустрэчы абменьваюцца дзяжурным «ну як?» і нацягваюць на твар нешта накшталт ветлівай усмешкі, а на самых — як лічыць Віктар — сапраўдных. Спяшаецца на заняткі — «Салям, Віктар! Рады вітаць цябе, сябар». У інтэрнат вяртаецца— «Банжур, камарад!..» І з кожным — немцам ці арабам, кубінцам ці в'етнамцам — знаходзіць ён агульную мову.

— Ёсць людзі, якім супрацьпаказана раўнадушша,— гаворыць студэнт з Ірака Мухамед Альван Хасун.— Віктар іменна з такіх.

— Прыемна адчуваць, што побач з табой сапраўдны камсамольскі важак.— Гэта ўжо словы афганскага студэнта Ханмухамеда...

— Віктар, падзяліся сакрэтам грамадскай работы,— неаднойчы звярталіся да яго.

Спярша здзіўляўся:

— Які сакрэт? Гэта ў чараўнікоў яны, напэўна, ёсць, сакрэты. Асабіста я па кнігах вучуся. А калі сур'ёзна, дык на старэйшых таварышаў мне пашанцавала. На Ігара Велічанскага, напрыклад. Ігар у свой час узначальваў інтэрсектар гістарычнага. Ён і прапанаваў мне, тады яшчэ «зялёнаму» першакурсніку, падрыхтаваць і правесці некалькі мерапрыемстваў: спачатку вечар дружбы, затым суботнік. «Абкатаць» хацеў. Я паспрабаваў, ды так і захапіўся гэтай справай. Вось і ўвесь сакрэт.

Гэта сапраўды так. Але верна і тое, што многія з нас, паспрабаваўшы зусім не салодкага хлеба інтэрработы, пакорна складваюць зброю. Наіўна было б думаць, што мы не разумеем важнасці такога ўчастка, як інтэрработа, а вось не клеіцца нешта — і ўсё тут. Віктар упарта, дзень у дзень робіць сваю справу.

Дык чым жа справа ставіцца? Чым бярэ Шадурскі ў сваёй рабоце?

Напэўна, традыцыямі. Той жа Ігар Велічанскі і цяпер, змяніўшы «армяк» студэнта на «мантыю» аспіранта, не здрадзіў «роднай стыхіі», з'яўляецца старшынёй дыскусійнага клуба «Палітыкус». «Лепіць думаючых актывістаў»,— як пазней растлумачыць мне Віктар. Аляксандр Новік, студэнт 5-га курса гістфака, намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па інтэррабоце... І тут падвесці Віктару — ну ніяк нельга.

А яшчэ, безумоўна, актывам. Калі б Шадурскі адзін, спадзеючыся на ўласныя сілы і здольнасці, «цягнуў воз», старанна адладжаны механізм інтэрработы на факультэце пачаў бы працаваць са збоямі, калі б зусім не спыніўся. Але добра памятаў Віктар словы Пятра Аксючыца, былога сакратара камітэта камсамола факультэта: «Шукай аднадумцаў і паплечнікаў. А знойдзеш — смела абапірайся на іх». Сёння гісторыкі могуць ганарыцца сваімі кадрамі: Святлана Дзягцяр і Святлана Кацяновіч, Аляксандр Самуйліч і Штэфан Меліх, Хан Мухамед і Алена Нецікава... Калі б кожны працаваў паасобку — выдыхнуўся б. А ўсе разам — любая справа ў ахвотку. Што табе вечар, што дыспут.

І не ў меншай ступені арганізацыяй...

І асабістымі якасцямі тых, каму даручана весці справу...

Віктар пачынаў, як і большасць з нас: школа, універсітэт. Біяграфія звычайная. Дакладней, самы яе пачатак — першыя радкі на чыстым аркушы жыцця. У школе захапляўся гісторыяй, ва універсітэце палюбіў гэты прадмет яшчэ больш, бо зразумеў, што дзень учарашні неадрыўны ад дня сённяшняга.

Мінулае лета з'явілася для Шадурскага парой новых выпрабаванняў. На вынослівасць. На патрабавальнасць — яму даручылі ўзначальваць інтэрнацыянальны СБА імя Г. Дзімітрава. Дваццаць балгарскіх і дзевятнаццаць савецкіх студэнтаў працавалі ў калгасе «17 верасня» Нясвіжскага раёна. І няхай занялі дзімітраўцы не першае, а другое месца сярод СБА факультэта — у сумеснай працы і адпачынку нарадзіўся дружны калектыў. Віктар Шадурскі ў гэтым ні на ёту не сумняваецца:

— Галоўнае — атрад жыве. І прыемна адчуваць, што нашы балгарскія другары з нецярплівасцю чакаюць наступнае лета, каб зноў сустрэцца з намі.

Яму імпануе неспакойнае жыццё. Грамадская работа, лічыць Шадурскі, рассоўвае межы ўяўлення аб уласных магчымасцях і магчымасцях тваіх сяброў. Гэта — па-першае. Па-другое, уменне крочыць у нагу з калектывам, адчуваць асабістую адказнасць за даручаную справу — неад'емны абавязак кожнага камсамольца. Па-трэцяе, Віктар ў будучым — настаўнік. А на чым настаўнік павінен выхоўваць вучняў, як не на ўласным прыкладзе?

Кожны новы дзень ставіць перад Шадурскім новыя пытанні: трэба рыхтавацца да бюро камітэта камсамола універсітэта, сустрэцца з кіраўнікамі чэхаславацкага зямляцтва, арганізаваць КВЗ. А тут час падаспеў афармляць у інтэрнаце пакой дружбы: толькі-толькі сабраліся гісторыкі пад адным дахам. І кнігу цікавую ды разумную прачытаць хочацца: у ёй — праўда жыцця. Тая праўда, да якой імкнецца Віктар Шадурскі, студэнт чацвёртага курса гістарычнага факультэта, член камітэта камсамола факультэта і універсітэта.

**А. ЛАЗОЎСКІ,**
**наш кар.**

# Не старэе душой ветэран

**Часам, здаецца, ведаеш чалавека не першы год, лічыш добрым знаёмым, і раптам, у адзін дзень, адкрываеш у ім рысу незвычайную, якасці адметныя.**



*«Больш як сорак гадоў назад Іван Васільевіч Марчанка стаў студэнтам Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, актыўна ўключыўся ў грамадскую работу».*

*(З характарыстыкі).*

Напярэдадні дамовіліся сустрэцца з Іванам Васільевічам непасрэдна перад канферэнцыяй. Аднак раніцой ён сам зайшоў у рэдакцыю, павітаўся, пацікавіўся справамі. Мажны, з жывінкай у праніклівых вачах, імклівы і дакладны ў рухах, ён напоўніў рэдакцыйны пакой самім жыццём, бадзёрым аптымізмам. Ці слухаў субяседнікаў, ці сам аб нечым расказваў — усё такі ж нястрымны, няўрымслівы.

Загаварылі аб канферэнцыі. Студэнты і супрацоўнікі фізічнага факультэта запрасілі да сябе ўдзельніка Сталінградскай бітвы, былога начальніка штаба 64-й арміі, генерал-лейтэнанта ў адстаўцы І. А. Ласкіна. Іван Андрэевіч — чалавек цікавага лёсу: ваяваў на франтах грамадзянскай, сустракаўся з легендарным камдзівам Чапаевым, а ў гарачым сорак трэцім разам з байцамі браў у палон фельдмаршала Паулюса.

Канферэнцыя, безумоўна, атрымаецца — фізікі народ абавязковы. Ды Іван Васільевіч не можа заставацца ў баку. З далёкай юначай пары вынес ён пачуццё асабістай адказнасці за любую справу. У гарачых буднях «трывожнай маладосці» гартаваўся яго характар: камсамольскія сходкі, барацьба з непісьменнасцю, выступленні перад калгаснікамі... Нават з вышыні сённяшняга дня тыя справы не здаюцца звычайнымі, нязначнымі.

Ад маці і бацькі сабе ў спадчыну атрымаў ён веру ў людзей, павагу да працы. Бацькі выхоўвалі ў сына галоўныя чалавечыя якасці: сумленнасць, самастойнасць, вучылі не хавацца за чужую спіну. Нібы ведалі, што чакае яго наперадзе.

Цяжка давалася часам бацькоўская навука. Ды Іван Марчанка не з палахлівых быў: у саракавым з атэстатам выдатніка закончыў сярэднюю школу ў Слаўгарадзе і ў тым жа годзе паступіў на філалагічны факультэт універсітэта. Вучоба, камсамольскае жыццё захапілі юнака. Свет адкрываў перад ім свае таямніцы...

*«У перыяд Вялікай Айчыннай вайны Іван Васільевіч Марчанка— на фронце. Там ён быў прыняты ў рады КПСС. За паспяховае выкананне заданняў камандавання ўзнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі».*

*(З характарыстыкі).*

Канферэнцыя сапраўды атрымалася. І сівы генерал— вайна няшчадна апаліла яго скроні, і былы лейтэнант — сталінградская маладосць адчувалася ў яго словах, і Іван Васільевіч гаварылі пра тых, хто ў цяжкі час выпрабаванняў узняўся на абарону Радзімы, нібы гарталі свяшчэнныя старонкі памяці. І паўстала яна перад Іванам Васільевічам шалёнай бамбёжкай Мінска — на другі дзень вайны вораг хацеў зраўняць з зямлёй горад, і словамі ваенкома: «Вы нам тут патрэбны, хлопцы. Перадавая не толькі на фронце, яна і ў тыле». І халоднымі цэхамі завода імя Сярго Арджанікідзе ў Мураме, дзе Ваня Марчанка, учарашні студэнт, стаў «класным» слесарам: збіраў пад'ёмныя і паваротныя механізмы для пушак і танкавых гармат. Сярод тых гармат, што нішчылі ворага пад Масквой і Сталінградам, безумоўна, былі і яго, Вані Марчанкі. У пачатку сорак другога яго, нарэшце, накіроўваюць у Омскае пяхотнае вучылішча (сёння цяжка сказаць, якая па ліку заява прабіла «браню» броні). А затым — Паўночна-Заходні фронт, баі пад Ленінградам, за Востраў, Пскоў, Волгу, Рыгу, вызваленне Беларусі, Украіны... За Радзіму, за сваю маленькую вёску Людкова ваяваў І. В. Марчанка, нібы ўбіваў цвікі ў труну фашысцкай пачвары.

У вайны, сапраўды, «не жаночы твар». І няма сэнсу дзяліць баі на жорсткія і «мясцовага значэння», а дні — на радасныя і чорныя — не костачкі на лічыльніках перакідваць. Ды два з соцень запомніў Іван Васільевіч: першы, калі ўручалі яму ордэн Чырвонай Зоркі, другі —у пачатку мая, пераможны.

Вайна закончылася, але не адразу зняў афіцэрскую форму Іван Марчанка: 23-гадовага капітана накіроўваюць у Бабруйск, затым у Мінск.

— Родны горад нагадваў суцэльнае пажарышча —нібы страшэнная бура пранеслася над ім, — успамінае Іван Васільевіч. — Вораг знішчыў усё, што можна знішчыць — дамы, паркі, музеі... Універсітэт таксама. Ды аднаго адолець не змог — свяшчэннай веры народа ў дзень заўтрашні.

Жыла яна і ў сэрцы Івана Васільевіча. Што, калі не вера, дапамагло паспяхова закончыць універсітэт, Ленінградскі вышэйшы педагагічны інстытут?

*«Іван Васільевіч Марчанка ўважлівы, чулы педагог, клапатліва адносіцца да студэнцкай моладзі, карыстаецца ў яе вялікім аўтарытэтам і павагай».*

*(З характарыстыкі).*

Гавораць, што жыве ў дзецях справа іх бацькоў. Так гэта ці не, ды толькі стаў І. В. Марчанка выкладчыкам. Не па прымусу стаў, па прызванню. Мне давялося прысутнічаць на яго лекцыі. І вось што заўважыў: стаяў перад студэнтамі не нейкі там «вучоны муж», а старэйшы таварыш, добры сябар і дарадчык. Ці не таму трэцякурснікі, самі будучыя гісторыкі, доўга не хацелі адпускаць яго з аўдыторыі — усё задавалі і задавалі пытанні...

Бацькі пасеялі ў яго душы насенне, якое затым прарасціло, напаілі жыццёвымі сокамі людзі неабыякавыя, розумам светлыя, сэрцам добрыя. Гэта і брат бацькі Іван Емяльянавіч (аб ім так хораша напісаў у сваіх успамінах Кастусь Кірэенка), і дырэктар Слаўгарадскай сярэдняй школы С. Г. Статкевіч, пазней заслужаны настаўнік БССР, і класны кіраўнік Ю. Б. Драгун, у гады вайны ўдзельнік падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Лідскага раёна, і былы настаўнік школы, цяпер доктар гістарычных навук, прафесар Ц. Е. Саладкоў, і выкладчыкі універсітэта І. В. Гутараў, М. І. Гурскі, былы рэктар БДУ П. П. Савіцкі... Пройдзе час, і нехта з сённяшніх студэнтаў назаве Івана Васільевіча сваім настаўнікам. Так будзе. Хіба можа забыцца справа, якой сёння самаададна ён служыць?

*«Шматгранную педагагічную работу І. В. Марчанка паспяхова сумяшчае з актыўнай грамадскай дзейнасцю, больш за дзесяць гадоў ён выбіраецца ў састаў партыйнага камітэта універсітэта, шмат сіл і энергіі аддае арганізацыі ваенна- патрыятычнай, абаронна-масавай, інтэрнацыянальнай работы».*

*(З характарыстыкі).*

— Іван Васільевіч, — Анатоль Леванюк, член групы «Доўг» універсітэта, звяртаецца да І. В. Марчанкі, — патрэбна ваша дапамога. Камітэт камсамола універсітэта прапанаваў нам запісаць на магнітафон успаміны былых франтавікоў і партызан Вялікай Айчыннай. Як вы думаеце, ці падтрымаюць нас?

— Іван Васільевіч, дапамажыце, калі ласка, арганізаваць сустрэчу з Героем Савецкага Саюза А. Р. Мазанік...

— Іван Васільевіч...

Студэнты, выкладчыкі звярталіся да яго за дапамогай, парадай. Аб чым у гэты час думаў ён, член партыйнага камітэта, старшыня савета ветэранаў універсітэта, дацэнт кафедры гісторыі БССР? Аб тым, што не толькі падтрымае добрую справу пошукаўцаў, але дапаможа ажыццявіць іх задуму, аб тым, што будуць ва універсітэце новыя сустрэчы, канферэнцыі. І яшчэ, напэўна, аб тым, што заўтра ў каторы ўжо раз прыйдзе ён у родны універсітэт нібы на спатканне са сваёй маладосцю, са сваёй памяццю. Прыйдзе салдат, выкладчык, камуніст.

...Размаўляючы з Іванам Васільевічам Марчанкам, слухаючы яго лекцыі і выступленні, разглядаючы фотаздымкі з багатага альбома, я убачыў у ім чалавека характару неспакойнага, да сябе бязлітаснага, да іншых шчырага. Што адкрыю ў ім заўтра, паслязаўтра, праз месяц?..

**А. ЦІХАН,**
**наш кар.**

● Якія бываюць аб'явы

● Вынікі рэйду насцярожваюць

● Да каго трапляе газета?

● Хто каго? (Да пытання аб курыльшчыках).

# Афіцыйны аддзел Ліхтарыка

НЯДАЎНА ШТАБАМ «КП» БДУ імя У. І. Леніна праведзены рэйд па праверцы работы студсаветаў інтэрнатаў па стварэнню нармальных умоў для пражывання і адпачынку студэнтаў, выкараненню выпадкаў парушэнняў грамадскага парадку, узмацненню рэжыму эканоміі энергетычных, цеплавых і матэрыяльных рэсурсаў. Матэрыялы рэйду разгледжаны на пасяджэнні камісіі парткома універсітэта па рабоце ў інтэрнатах. Па многіх пытаннях работа студсаветаў прызнана нездавальняючай. Матэрыялы рэйду знойдуць таксама водгук на пленуме камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна, які адбудзецца 17 снежня.

●

МАСАВАЯ ПРАВЕРКА наведвання студэнтамі заняткаў праведзена 7 снежня «пражэктарыстамі» універсітэта. Яе вынікі сведчаць аб тым, што акадэмсектарамі і вучэбна-выхаваўчымі камісіямі справа кантролю наведвання фактычна пушчана на самацёк. Інакш нельга растлумачыць той факт, што на фізфаку адсутнічала 120 чалавек, на мехмаце — 54. На іншых факультэтах «малюнак» таксама не лепшы. Штаб «КП» запланаваў аналагічную праверку на канец снежня.

●

ЗНАЧКОМ ЦК ВЛКСМ «Камсамольскі пражэктар» узнагароджаны лепшыя камсамольскія дазорныя універсітэта: В. Зайчыкава, І. Мамедаў, С. Сакалоўская, Т. Юзвенка, Я. Танана, Я. Церахаў.

## «Па шчупаковаму загаду»

**ПАМЯТАЕЦЕ вядомага казачнага героя, які пасябраваў са шчупаком? Скажа ён: «Па шчупаковаму загаду...» — і жаданне адразу збываецца...**

**Студэнты, якія жывуць у інтэрнатах №№ 1 і 6, не казачныя героі. Але ад шчупаковай дапамогі і яны не адмовіліся б. Справа ў тым, што газеты, якія студэнты выпісваюць, далёка не заўсёды трапляюць да сваіх адрасатаў. Вось што расказалі ЛІХТАРЫКУ старшыні штабоў «КП» двух факультэтаў.**

**Аляксандр КАХАНОЎСКІ, гістфак:**

— З пачатку года ўсё было добра. Газеты, якія прыходзяць у інтэрнат № 1, пачалі разносіць па паверхах. Былі вызначаны адказныя, іх работу кантраляваў студсавет. «Навінка» пражыла месяц-другі і... знікла. І зноў кожны дзень газеты ляжаць у агульнай кіпе ля вахцёра. Затрымаўся крыху пасля заняткаў, і ўсе нумары ўжо расхапілі. Чаму б зноў не арганізаваць карысную справу?

**Яўген ЦЕРАХАЎ, ФПМ:**

— У інтэрнаце № 6, дзе жывуць нашы студэнты, дастаўка газет на паверхі існуе і сёння. Кожную раніцу дзяжурныя спраўна атрымліваюць іх, разносяць па пакоях. А калі пакой зачынены і студэнты ўжо на занятках? Іменна так часцей за ўсё і бывае. Вось і думае дзяжурны, як хутчэй «падарыць» свежыя нумары першаму сустрэчнаму.

Што б, здаецца, прасцей: неабходна толькі ўзмацніць кантроль за распаўсюджваннем газет дзяжурнымі з боку студсаветаў. Але гэтая справа, якая не заслугоўвае, на погляд Ліхтарыка, столькі ўвагі, пагражае перарасці ў цэлую праблему. І каб пазбегнуць гэтага, студсаветам патрэбна разлічваць на свае, а не на казачныя сілы.

## «Міністэрства аховы здароўя і Ліхтарык папярэджваюць...»

НЕ ЗНОЙДЗЕЦЦА, напэўна, чалавека, якому не было б знаёма: «Міністэрства аховы здароўя папярэджвае: курэнне небяспечна для вашага здароўя». Усе ведаюць, вядома, і аб тым, што чалавек, які не курыць, трапіўшы ў «дымнае» асяроддзе, вымушаны ўжываць нікаціну ў паўтара раза больш за курыльшчыка. Ведаюць, але...

Паразважайце самі. Існуе спецыяльны загад па універсітэту, што забараняе курэнне ў вучэбных карпусах, адміністрацыйных будынках і інтэрнатах. На калідорах, у холах і вестыбюлях вывешаны шматлікія таблічкі: «НЕ КУРЫЦЬ!». Адведзены, нарэшце, спецыяльныя месцы, дзе самыя заядлыя курыльшчыкі змогуць задаволіць сваё жаданне. І што ж? На жаль, колькасць курыльшчыкаў не змяншаецца. Кураць студэнты і выкладчыкі, навуковыя супрацоўнікі і лабаранты. Кураць у службовых кабінетах, на кафедрах, у лабараторыях і вучэбных аўдыторыях.

Ці ёсць выйсце з гэтай сітуацыі? Ліхтарык перакананы, што ёсць. Кожны павінен звярнуць увагу на сябе.

## «Мяняю... куплю... прадам...»

НАСЦЕННЫ «філіял» вядомага рэкламнага дадатка да газеты «Вячэрні Мінск» адкрыўся нядаўна на вуліцы Ленінградскай. У якасці дошкі аб'яў была выбрана чамусьці сцяна будынка хімічнага факультэта. На жаль, нічога незвычайнага сярод змешчаных там аб'яў Ліхтарыку знайсці не давялося. Усё тыя ж набіўшыя аскоміну прапановы прадаць поўны камплект шпаргалак па курсу тэорыі верагоднасцей, купіць канспект лекцый па квантавай механіцы ў добрым стане і г. д.

Аб'явы мочыць дождж, зрывае шаляніца-вецер, спрабуе знішчыць мароз — але ўсё дарэмна! На дзіва жывучыя яны. На месцы знішчаных зараз жа паяўляюцца новыя, яшчэ больш прывабныя і красамоўныя. Вось толькі арфаграфічных памылак у іх часцяком зашмат. Аўтару адной з такіх аб'яў Ліхтарык прапанаваў (тэлефоны гаспадароў — да вашых паслуг!) паступаць на філфак, каб ліквідаваць відавочныя хібы ў веданні рускай мовы. Раз'юшаная ад такой парады жанчына вырашыла за лепшае сарваць свае аб'явы са сцен універсітэта. Так за адну ноч у насценным «філіяле» стала на некалькі экспанатаў меней. Калі ж спыніць работу і ўвесь «філіял»? Хто дапаможа яму ў гэтым?

# ШКОЛА КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

### ДА ВЫНІКАЎ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЙ АТЭСТАЦЫІ НА ФІЛАЛАГІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

У ПАЧАТКУ кожнага навучальнага года камсоргі, члены камсамольскіх бюро груп усё часцей зазіраюць у сціслыя радкі пратаколаў, рыхтуюцца да правядзення справаздачна-выбарных сходаў, успамінаюць мерапрыемствы, якія былі праведзены на працягу года.

На справаздачна - выбарным сходзе падводзяцца вынікі работы ўсяго калектыву. Камсамольцы аналізуюць дасягнутае ў вучобе, грамадска - палітычнай дзейнасці, ацэньваюць работу арганізацыі за справаздачны перыяд. Правядзенне такіх сходаў — адна з найбольш важных форм камсамольскай работы. Яны дазваляюць абмеркаваць справы і жыццё калектыву, зрабіць вывады, намеціць шляхі выкаранення недахопаў, удасканалення дзейнасці камсамольскай групы. Але на гэтых сходах аналізуецца агульная карціна работы, а вось асабісты ўклад кожнага камсамольца ў грамадскую работу ацаніць даволі цяжка. Іншая справа — грамадска-палітычная атэстацыя.

**Таццяна СОТЧАНКА, сакратар камітэта камсамола філалагічнага факультэта:**

**— Грамадска - палітычная атэстацыя — гэта форма работы, якая дазваляе спытаць з кожнага камсамольца аб яго актыўнай жыццёвай пазіцыі.**

Грамадска - палітычная атэстацыя садзейнічае ідэйнаму росту юнакоў і дзяўчат, выхаванню іх сапраўднымі будаўнікамі камуністычнага грамадства. У час правядзення гэтай кампаніі кожны камсамолец рапартуе аб сваіх дасягненнях, аб асабістым укладзе ў выкананне гістарычных рашэнняў XXVI з'езда КПСС і XIX з'езда ВЛКСМ.

**Таццяна СОТЧАНКА:**

**— Раней атэстацыя праводзілася раз у год, звычайна ў сакавіку. Цяпер жа двухразовая форма падвядзення вынікаў, на мой погляд, яшчэ больш спрыяе далучэнню камсамольцаў да грамадскай работы, дае магчымасць больш уважліва прыгледзецца да кожнага, дапамагчы знайсці сябе.**

Падрыхтоўка да атэстацыі вядзецца, па сутнасці, з вясны, калі складаюцца асабістыя комплексныя планы. Рыхтавацца да атэстацыі — гэта значыць паступова ператвараць у рэальныя дзеянні кожны радок свайго плана.

**Таццяна СОТЧАНКА:**

**— Кожнаму студэнту мы імкнемся даць грамадскае даручэнне. А спраў, што чакаюць хуткага ажыццяўлення, у нас дастаткова. Гэта і педагагічныя атрады, і факультэт грамадскіх прафесій, і камісіі пры кожным сектары камітэта камсамола... Кожны павінен знайсці сабе справу — гэта ўстаноўка нашага камітэта.**

Грамадска - палітычная атэстацыя сістэматызуе работу камсамольцаў. Калі ў асабістым комплексным плане адзначана: вывучыць пэўныя работы класікаў марксізму - ленінізму, прачытаць некаторыя мастацкія творы, пастаянна наведваць пасяджэнні якога-небудзь навуковага гуртка, удзельнічаць у самадзейнасці, у спартыўных мерапрыемствах, то студэнт ужо канкрэтна ўяўляе, дзе ён павінен пабываць, што зрабіць.

Ці правільна ты арганізаваў сваю вучобу, ці хапіла часу, каб ажыццявіць усё намечанае, ці добрасумленна выканаў даручаную справу? На гэтыя пытанні даюць адказ не толькі атэстуемы, але і яго таварышы. Каму ж, як не групе, аб'ектыўна ацаніць работу? І меркаванне калектыву мае рашаючае значэнне пры выстаўленні дыферэнцыраванага заліку.

**Таццяна СОТЧАНКА:**

**— Мы давяраем калектыву. Якія б розныя людзі ні былі ў адной групе, але ў грамадзе амаль заўсёды нараджаецца правільнае рашэнне, тым больш, што калектыў дае ацэнку работы свайго члена, якога ўсе добра ведаюць у паўсядзённай вучобе.**

**Прыклад? Другая група трэцяга курса беларускага аддзялення — пераможца сацыялістычнага спаборніцтва — атрымала права праводзіць грамадска - палітычную атэстацыю без камісіі. Калектыў аднадушна вылучыў лепшых у вучобе і грамадскай дзейнасці. Сярод іх — Таццяна ЗЯЛІНСКАЯ, Галіна ІВАНОВА, Віктар КАЎХУТА.**

Атэстацыя выяўляе надзённыя праблемы. Згадзіцеся, не вельмі часта даводзіцца збірацца групе, каб проста пагутарыць пра зробленае, пра атмасферу ў калектыве, месца кожнага ў ім. Горы вучэбнай літаратуры, розныя мерапрыемствы, асабістыя інтарэсы — яны чамусьці перашкаджаюць быць разам. Грамадска - палітычная атэстацыя — гэта адна з тых падзей, якія падкрэсліваюць, прымушаюць адчуць (а можа і пашукаць) тыя нябачныя сувязі, што пранізваюць здаровы калектыў.

**Людміла ПЯЗЕНКА, намеснік сакратара камітэта камсамола па ідэалогіі філалагічнага факультэта:**

**— У час атэстацыі прарываюцца нейкія глыбінныя патокі, і чалавек выказвае ўсё, што набалела, што вынашана доўгімі роздумамі, назіраннямі. Асабліва цікава, па-мойму, прысутнічаць на атэстацыі пяцікурснікаў. Меркаванні таварышаў, побач з якімі ты крочыў усё сваё студэнцкае жыццё, у значнай ступені дазваляюць глянуць кожнаму на сябе вачамі сяброў.**

Такім чынам, грамадска-палітычная атэстацыя з'яўляецца вельмі важным сродкам выхавання кожнага члена пярвічнай камсамольскай арганізацыі. Атэстацыя паказвае становішча ў калектыве, дазваляе ўбачыць недахопы, адзначае поспехі. Удзельнікі заліку, рыхтуючыся да справаздачы, імкнуцца выканаць асабістыя комплексныя планы, якія накіраваны на рост творчай актыўнасці моладзі, павышэнне яе маральнага і ідэйнага ўзроўню, на выпрацоўку актыўнай жыццёвай пазіцыі.

**А. ГРЫШКЕВІЧ,**
**студэнтка журфака.**



*НА ФІЛАЛАГІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ адбыўся літаратурны вечар, прысвечаны стагоддзю з дня нараджэння вядомага савецкага пісьменніка Аляксея Мікалаевіча Талстога. Вечар адкрыў загадчык кафедры рускай і савецкай літаратуры І. П. Кахно. З дакладамі аб жыцці і творчасці пісьменніка выступілі студэнты.*
Фота **В. Шачака.**

# Спаборнічаюць арыенціроўшчыкі





У СЁМЫ РАЗ аматары спартыўнага арыентавання сустрэліся на лясных дыстанцыях адкрытага першынства спортклуба БДУ.

Спартыўнае арыентаванне — гэта праверка ўмення ў незнаёмых абставінах хутка прымаць адзіна правільнае рашэнне. У гэтым відзе спорту ад спартсмена патрабуюцца вялікая вытрымка і мэтанакіраванасць.

Спаборніцтвы праходзілі два дні. У іх прымалі ўдзел студэнты БДУ, БДІНГ, МРТІ, спартсмены Мінскага завода аўтаматычных ліній, завода вылічальнай тэхнікі, арыенціроўшчыкі са Львова. Удзельнікі выступалі ў дзвюх групах: у групе «А»—спартсмены II, I разрадаў, кандыдаты ў майстры і майстры спорту; у групе «Б»—спартсмены III разраду, юніёры і навічкі.

У першы дзень сярод мужчын групы «А» (даўжыня дыстанцыі 7,7 км, 9 КП) выйграў студэнт інстытута народнай гаспадаркі Андрэй Каралевіч, другое месца заняў Аляксандр Буднік (СК «Вымпел»), трэцяе — Анатоль Крывенькі (МРТІ). На другі дзень (10 км, 10 КП) ва ўпартай барацьбе перамог майстар спорту з інстытута народнай гаспадаркі Віктар Чахлоў, які на некалькі мінут абагнаў Каралевіча і выйшаў на першае месца па выніках двух дзён. А. Каралевіч заняў другое месца, на трэцім — А. Буднік.

Сярод жанчын групы «А» па суме вынікаў двух дзён перамогі дабілася студэнтка другога курса біялагічнага факультэта Тамара Волкава, усяго сем мінут ёй прайграла Вольга Карагодзіна, на трэцім месцы Святлана Пaборцава (завод аўтаматычных ліній). Сярод мужчын групы «Б» лепшых вынікаў дабіўся Уладзіслаў Кузьмін, а ў жанчын перамагла першакурсніца факультэта прыкладной матэматыкі Алена Русак.

Прызёры спаборніцтваў узнагароджаны граматамі і памятнымі прызамі, пераможцы — граматамі, памятнымі прызамі і медалямі.

**І. ЗНАК,**
**студэнт геаграфічнага факультэта, суддзя спаборніцтваў.**
Фота **аўтара.**



АД МАСАВАСЦІ — ДА МАЙСТЭРСТВА

# СА СВЯТОЧНЫМ НАСТРОЕМ

ТАК, ва універсітэце вялікае свята — пачаліся спартыўныя спаборніцтвы, якія уваходзяць у залік XXXI спартакіяды. І гэтае свята працягнецца да канца навучальнага года — да апошняга старту.

Зайдзіце ў спартыўную залу універсітэта. Яна ніколі не пустуе, цяпер — тым больш. Яе запаўняюць баскетбалісты і валейбалісты, якія аспрэчваюць чэмпіёнскія тытулы універсітэта. Хутка згуляюць свае першыя партыі шашысты. Пройдзе яшчэ тыдзень — і ў барацьбу ўступяць лёгкаатлеты. Спартыўнае жыццё ажыло, закіпела.

У трыццаць першы раз праводзіцца спартакіяда. У гэтым годзе яна своеасаблівая: прысвечана 60-годдзю ўтварэння СССР.

Спартакіяда ставіць сваёй мэтай, перш за ўсё, падрыхтоўку ва універсітэце здаровых, дужых, усебакова развітых спецыялістаў, гатовых да творчай працы і абароны краіны. Яна садзейнічае ўцягненню студэнтаў у рэгулярныя заняткі спортам, павышэнню ўзроўню іх спартыўнага майстэрства, падрыхтоўцы зборных каманд універсітэта да XXXI рэспубліканскай спартакіяды студэнтаў і асобных спартсменаў да VIII летняй спартакіяды БССР і VIII летняй Спартакіяды народаў СССР.

Удзельнікам спартакіяды можа быць кожны, хто займаецца спортам. Масавасць і майстэрства — вось галоўны дэвіз гэтых спаборніцтваў.

Побач з тытулаванымі спартсменамі стартуюць студэнты, чые імёны невядомы для шырокага кола аматараў спорту. Многія з іх першы раз выйшлі на такія буйныя спаборніцтвы. Радасць удзелу, прыемныя ўражанні застануцца на ўсё жыццё. І хіба можна не ганарыцца тым, што ты перамог перш за ўсё сябе, калі ўступіў у барацьбу.

У гэтым навучальным годзе тысячы студэнтаў, аспірантаў і супрацоўнікаў выйдуць на бегавыя дарожкі стадыёнаў, лыжныя трасы, футбольныя палі, валейбольныя і баскетбольныя пляцоўкі. Дваццаць шэсць відаў спорту ўключае ў сябе спартакіяда. Самымі масавымі з'яўляюцца спаборніцтвы па кросу, лыжах, футболу, лёгкай атлетыцы. А рэкорд належыць кубку першых курсаў па бегу на прыз газеты «Беларускі універсітэт», дзе за перамогу спрачаліся тысяча трыста студэнтаў.

Кожны факультэт можа выстаўляць каманды па ўсіх відах, але ў залік ідуць толькі лепшыя рэзультаты. Іх колькасць залежыць ад велічыні заліковага каэфіцыента, які, у сваю чаргу, устанаўліваецца па колькасці студэнтаў на факультэтах. Самыя высокія каэфіцыенты ў ФПМ і мехмата — 18, а самы меншы ў журфака — 8. Гэта значыць, што ў ФПМ і мехмата ў залік ідуць лепшыя рэзультаты па васемнаццаці відах спорту, а ў журфака — па васьмі. Затым дабаўляюцца прэміяльныя ачкі, і агульны рэзультат дзеліцца на велічыню каэфіцыента.

Як правіла, спаборніцтвы спартакіяды праходзяць на высокім арганізацыйным узроўні. Судзейскую калегію ўзначальвае загадчык кафедры фізвыхавання і спорту С. У. Макарэвіч, намеснік галоўнага суддзі — старшыня спортклуба А. С. Балдзін. На працягу многіх гадоў старэйшы спартыўны работнік універсітэта, суддзя рэспубліканскай катэгорыі М. А. Шэйнеман з'яўляецца сакратаром судзейскай калегіі. Спаборніцтвы будуць праводзіць суддзі ўсесаюзнай катэгорыі В. Я. Шхіньян (баскетбол), В. Ф. Кавалёў (цяжкая атлетыка), В. В. Абрамчанкаў (настольны тэніс), суддзі рэспубліканскай катэгорыі В. М. Лятун (вольная барацьба), В. А. Рудзянкоў (класічная барацьба), В. М. Рэйзін (спартыўная гімнастыка), В. В. Сеўба (мастацкая гімнастыка), В. А. Жаўнерка (лёгкая атлетыка), В. В. Зарэцкая (крос), М. Ф. Кузьмянкоў (плаванне), В. Д. Ліштван (футбол).

Разам са спартакіядай пачаўся XXXI агляд-конкурс сярод факультэтаў па фізкультурнай і спартыўна-масавай рабоце. У яго залік уваходзяць падрыхтоўка спартсменаў-разраднікаў, ахоп студэнтаў заняткамі ў спартыўных секцыях, правядзенне факультэцкіх спаборніцтваў і турысцкіх паходаў, арганізацыйная работа сярод членаў ДСТ «Буравеснік», агітацыя і прапаганда фізкультуры і спорту на факультэтах, работа па комплексу ГПА.

Шчыра кажучы, студэнты зачакаліся спартакіяды. Дзіўна, паўтара месяца не было універсітэцкіх спаборніцтваў. Гэта тлумачыцца тым, што лепшыя спартсмены універсітэта ўдзельнічалі ў розных стартах. Але можна было б знайсці выхад і правесці некалькі чэмпіянатаў універсітэта. У праграме спартакіяды гаворыцца, што к гэтаму часу арыенціровачна павінны прайсці спаборніцтвы па футболу, кубку першых курсаў па бегу, шахматах, па ўсіх відах барацьбы, фехтаванню, валейболу, баскетболу. Але пакуль толькі разыграны кубак першых курсаў па бегу, выступаюць баскетбалісты, валейбалісты. Пераянясенне тэрмінаў спаборніцтваў перш за ўсё адбіваецца на спартсменах і, зразумела, спартыўных бюро факультэтаў. Калі аднaчасова праводзяцца старты па некалькіх відах спорту, то яны адбіраюць многа часу ў студэнтаў, што перашкаджае іх вучобе. Не сакрэт, што некаторыя выступаюць у некалькіх спаборніцтвах, і сумяшчаць іх тады немагчыма. Спартыўным бюро факультэтаў цяжка камплектаваць каманды. Узнікае непатрэбная нервознасць. «Беларускі універсітэт» пісаў аб гэтым у красавіку. Хочацца верыць, што такога напружання не будзе цяпер.

У параўнанні з мінулым годам некалькі змянілася праграма спаборніцтваў, але калі адны змены сапраўды неабходны, то другія выклікаюць здзіўленне. Напрыклад, у лёгкай атлетыцы, дзе зніклі такія віды, як кіданне кап'я і дыска.

Самае балючае пытанне — удзел у спартакіядзе супрацоўнікаў. У мінулыя гады іх колькасць у саставах каманд была абмежавана. Цяпер жа такога няма. Правільна, супрацоўнікі павінны прымаць удзел у спартакіядзе разам са студэнтамі. Чым яны горшыя! Многія з іх уваходзяць у саставы зборных каманд універсітэта. Але сярод супрацоўнікаў праходзіць спартакіяда здароўя, там яны могуць паказваць сваё майстэрства.

Для студэнтаў з'яўляецца гонарам выступаць на універсітэцкіх спаборніцтвах. Спартакіяда — перш за ўсё старты студэнтаў. Неабмежаваная колькасць удзельнікаў з ліку супрацоўнікаў адыгрывае адмоўную ролю. Колькі было раней з-за гэтага спрэчак, асабліва ў ходзе турніраў па шашках і шахматах. А будзе значна болей.

У мінулым годзе за некаторыя факультэты выступалі «падстаўныя» спартсмены. Каманда юрыдычнага факультэта па летняму мнагабор'ю ГПА з-за гэтага была дыскваліфікавана. Але ў многіх выпадках суддзі глядзелі на «падстаўкі» скрозь пальцы. Гэта недаравальна.

...Спартакіяда фінішуе толькі ў чэрвені. Тады мы даведаемся, хто стаў яе пераможцам і прызёрам, а цяпер — уперад, спартсмены!

**У. АБРАМОВІЧ,**
**наш. кар.**



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
16 снежня 1982 г.
Зак. 2199 АТ 21639

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ